*southern borders of the country from the Danubian principalities involved in the sphere of its interests. Active protection of the interests of the Commonwealth from the claims of the Ottoman Empire was the main character.*

*УДК 94:327(476+474.5+438):94:323.269.6(476+474.5+438)«1648-1651»*

**С. А. Чаропка**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны

# ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА НАПЯРЭДАДНІ КАЗАЦКА-СЯЛЯНСКАЙ ВАЙНЫ 1648–1651 ГГ.

*У прадстаўленым артыкуле даследуюцца некаторыя аспекты звязаныя з пачаткам казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. у Вялікім княстве Літоўскім. У прыватнасці паказана структура і арганізацыя літоўскага войска, сістэма яго функцыяніравання, што дапамагае зразумець прычыны лёгкага пранікнення казацкіх загонаў ў Палессе і Падняпроўе і хуткае распаўсюджанне тут паўстання.*

Казацка-сялянская вайна з’яўляецца важная з’яваю ў гісторыі беларускага народа. Яна стала пачаткам зацяжнога ваеннага ліхалецця і істотна паўплывала на паступовае аслабленне не толькі вялікага княства, як асобнага суб’екта Польска-Літоўскай дзяржавы, але і ўсёй Рэчы Паспалітай. Казацка-сялянская вайна ўжо не раз станавілася прадметам вывучэння як айчыннымі, так і замежнымі гісторыкамі, аднак асобныя яе аспекты яшчэ патрабуюць даследавання. Да аднаго з такіх аспектаў належыць пытанне аб становішчы войска вялікага княства Літоўскага напярэдадні казацка-сялянскай вайны. Ужо існуюць сур’ёзныя работы, у якіх даследуецца войска Вялікага княства Літоўскага ў XVII ст. Сярод іх аўтараў трэба адзначыць Г. Сагановіча і Г. Віснера, а таксама Ю. Бохана, А. Шыляева, А. Рахубе [1–7]. Яны сур’ёзна асновы функцыяніравання літоўскага войска напярэдадні казацка-сялянскай вайны.

Пасля разгрому кароннага войска каля Жоўтых Вод і Корсуня, казацкія загоны наблізіліся да межаў Вялікага княства Літоўскага. Арганізаванага супраціўлення ў чэрвені 1648 г. у Вялікім княстве Літоўскім казакі не сустрэлі, што звязана не толькі са значнай іх падтрымкай мясцовым насельніцтвам, але і з асаблівасцю сістэмы абароны ў Рэчы Паспалітай у цэлым і Вялікім княстве Літоўскім



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

у прыватнасці. Сама сістэма функцыяніравання літоўскага войска, як і войска кароннага, была ўжо даволі архаічнай. Калі ў Заходняй Еўропе ўжо ў сярэдзіне XVI ст. асновай арміі было наёмнае войска, менавіта яно вырашала зыход бітваў, то ў Вялікім княстве Літоўскім, як і Польшчы, працягвала існаваць старая феадальная сістэма функцыяніравання арміі [1, с. 19]. Справа ў тым, што ў мірны час літоўскага войска фактычна не існавала.

Узброеныя сілы Вялікага княства Літоўскага ўмоўна складалася з пяці асноўных элементаў. *Першым элементам* з'яўлялася ўласна дзяржаўнае войска Вялікага княства, якое, у сваю чаргу, таксама складалася з некалькіх частак, якія будуць разгледжаны ніжэй.

*Другім элементам* з'яўлялася павятовае войска, якое збіралася мясцовымі соймікамі ў выпадку патрэбы. Павятовае войска магло налічваць адну і больш харугваў, якія складаліся з мясцовай шляхты або наёмных жаўнераў. На чале такой харугвы стаяў ротмістар, які меў у падпарадкаванні паручніка, харунжага і пэўную колькасць таварышоў з почтамі, у залежнасці ад вызначанай соймікам сумы. Часцей за ўсё ротмістрамі выбіралі кагосьці са знатных землеўласнікаў павета. Наймалі звычайна кавалерыю – казакаў або гусараў, значна радзей – рэйтараў і практычна ніколі – пяхоту або драгунаў. Базавым тэрмінам набору павятовай харугвы былі тры месяцы, якія адлічваліся з моманту попісу. Тым не менш, прафесійныя ваяры неахвотна ішлі на службу ў павятовыя харугвы, што тлумачылася кароткім тэрмінам службы, а таксама цяжкасцю атрымання за службу ўзнагароды ад гетмана або караля ў выглядзе матэрыяльных даброт.

*Трэцім элементам* з'яўляліся ўздапаможныя атрады леннікаў Рэчы Паспалітай – Прусіі і Курляндыі, якія звычайна выкарыстоўваліся падчас баявых дзеянняў у Прыбалтыцы. Колькасць гэтых войскаў была нязначнай і галоўнай іх функцыяй з'яўлялася ахова прыбалтыйскіх крэпасцей.

У якасці *чацвёртага элемента* можна вылучыць прыватныя войскі асобных магнатаў. Яны адыгрывалі пэўную ролю ў сістэме абароны Вялікага княства Літоўскага, аднак яны пакуль што не былі шматлікімі, таму што іх утрыманне каштавала вялікіх грошаў. Напрыкад у 1640 г. вялікі гетман літоўскі К. Радзівіл меў у сваім распараджэнні 100 татараў і 60 драгунаў, яго сын польны гетман літоўскі Я. Радзівіл у 1648 г. меў 200 драгунаў і 100 гайдукоў [8, с. 79]. Асноўным элементам прыватных войскаў з'яўляліся надворныя харугвы, якія маглі быць як пешымі, так і коннымі. Склад харугвы быў тыповым – на чале стаяў ротмістр, які меў у падпарадкаванні паручніка, харунжага, дзясятнікаў, але колькасць жаўнераў была адносна невялікай.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Так, у пяхотнай харугве К. Радзівіла ў 1631 г. налічвалася ўсяго 59 чалавек [2 с. 116]. Спробы асобных магнатаў стымуляваць да вайсковай службы сялян асаблівага посьпеху не мелі. Хаця ў Слуцкім княстве Радзівілаў у шэрагу вёсак пражывалі панцырныя і путныя баяры, рэальнай баявой сілы ў XVII ст. яны ўжо не ўяўлялі. Іх месца занялі выбранцы, колькасць якіх таксама была нязначнай. Прыватныя войскі маглі адыгрываць пэўную ролю ў палітычным жыцці краіны, але абараніць яе яны аб'ектыўна не маглі.

Апошнім, *пятым элементам* узброеных сіл можна лічыць атрады дабраахвотнікаў, якія маглі дзейнічаць самастойна. Такія атрады валанцёраў арганізоўваліся на кароткі час і сур'ёзнага значэння ў сістэме абароны краіны, натуральна, не адыгрывалі.

Трэба адзначыць, што з пералічаных элементаў узброеных сіл службовай асобе – вялікаму гетману літоўскаму, які адказваў за бяспеку дзяржавы, падпарадкоўваўся толькі першы элемент – дзяржаўная армія Вялікага княства. Выстаўленне на вайну іншых элементаў залежала ад рашэння канкрэтных уласнікаў гэтых войскаў – павятовага сойміка, пэўнага магната і г. д. [2, с. 63].

Дзяржаўнае войска Вялікага княства Літоўскага, якое з'яўлялася асновай ўзброеных сіл, уключала ў сябе два асноўных кампаненты – паспалітае рушанне і кварцянае войска.

Аснову літоўскага войска тэарэтычна складала паспалітае рушанне – шляхецкае апалчэнне, якое склікалася ў выпадку пільнай неабходнасці. Паводле артыкула 1 раздзела 2 Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. усе земляўласнікі дзяржавы, а гэта перш за ўсё шляхта, абавязаны былі прымаць удзел у абароне краіны [9]. Права збору паспалітага рушання належала вальнаму сойму, таму аператыўна сабрацца шляхецкае апалчэнне проста не магло. Сама сістэма мабілізацыі шляхты таксама патрабавала часу. Пасля станоўчага рашэння сойму вялікі гетман выдаваў адпаведны ўніверсал, які дастаўляўся ў рэгіёны. На павятовым узроўні зборам войска займаліся харунжыя, якія прыводзілі свае харугвы пад уладу мясцовага ваяводы. Пасля гэтага харугвы ад кожнага ваяводства, разам з асобнымі почтамі тых або іншых магнатаў збіраліся ў вызначаным месцы, дзе праводзіўся попіс войска, пасля якога яно лічылася сабраным і перадавалася пад уладу гетмана.

Для падтрымкі баяздольнасці паспалітага рушання час ад часу павінны былі праводзіцца агляды, на якія павінны былі з'яджацца ўсе шляхціцы. На павятовым ўзроўні за збор шляхты на агляд маршалак, харунжы або войскі, на ваяводскім – ваявода, кашталян або харунжы. Аднак нягледзячы на шматлікія рашэнні сойма, агляды

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

праводзіліся вельмі рэдка [2, с. 90]. На працягу першай паловы XVII ст. у шляхецкім грамадстве Вялікага княства Літоўскага, як дарэчы і ў Заходняй Еўропе, назіраецца тэндэнцыя да зніжэння цікавасці да вайсковай службы. Занятая гаспадаркай шляхта імкнулася пазбавіцца неабходнасці часта пакідаць свой дом для ўдзелу ў непатрэбных для іх войнах. У выпадку, калі была магчымасць адкупіцца ад пачэснай справы абароны Радзімы, частка шляхты гэтай магчымасцю карысталася, што адкрывала шлях да фарміравання сапраўды прафесійных вояроў з тых шляхціцаў, якія бачылі сродкі для свайго існавання ў вайсковай службе. Аднак заканадаўчая база была недасканалай, таму што ў выпадку збора паспалітага або павятовага рушання такі прафесіянал мусіў пакінуць сваю службу і з'явіцца на службе земскай. У сувязі з гэтым прафесійныя жаўнеры дамагаліся, каб іх не прыцягвалі да земскай службы [7, s. 383].

Мабілізацыйныя здольнасці літоўскага паспалітага рушання ў сярэдзіне XVII ст. складалі 23 тыс. чалавек, але нават у такіх крызісных умовах, у якіх апынулася Вялікае княства Літоўскае ў 1648–1667 гг. яны вычарпаны не былі [2, с. 96]. Выдатнымі баявымі якасцямі паспалітае рушанне таксама не адрознівалася ў сувязі з некалькімі прычынамі. Першай сур'езнай праблемай паспалітага рушання была слабасць людскога матэрыялу. Многія шляхціцы, якія былі заняты сваёй гаспадаркай, доўгі час не мелі дачынення да вайсковай службы і былі непадрыхтаванымі да сучасных умоў нясення службы, мелі нізкі ўзровень фізічнай і ваеннай падрыхтоўкі, адрозніваліся нізкай дысцыплінай і баявым духам.

Другой праблемай з'яўляўся дрэнны ўзровень узбраення і рыштунку паспалітага рушання. Колькасць і якасць зброі ваяра залежала ад матэрыяльнага ўзроўню кожнага канкрэтнага шляхціца або магната, у почаце якога ён знаходзіўся, хаця існавалі і пэўныя правілы. У прыватнасці артыкул 1 раздзела 2 Статута 1566 г. прадугледжваў, што кожны шляхціц павінен быў з'явіцца "з усім на добрым кані, каб конь каштаваў не менш за 8 коп грошай літоўскіх, а на ім каляровая сукня, панцыр, прылбіца, меч, павеза, дрэва з прапарцам каляровым" [10]. Тым не менш, у рэальнасці шляхта з'яўлялася на попіс з тым, што мела. Такім чынам, у адной павятовай харугве маглі знаходзіцца і казакі, і гусары, і пяцігорцы, што значна аслабляла баяздольнасць шляхецкага апалчэння. Лепш выглядала татарская кавалерыя, але яе было адносна няшмат.

Сапраўды баяздольнай часткай узброеных сіл Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст. усё ж з'яўлялася наёмная армія. Спробы стварэння рэгулярнай наёмнай арміі адносяцца да часу праўлення



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Жыгімонта Аўгуста ў сярэдзіне XVI ст. Гэтая войска, якое атрымала назву "кварцянае", фінансавалася з гаспадарскіх зямель і падпарадкоўвалася непасрэдна каралю. Кварцянае войска складалася з рот на чале з ротмістрамі, якія падзяляліся на дзясяткі (на чале з дзясятнікамі ў пяхоце) і почты (на чале з таварышамі ў кавалерыі). У мірны час наёмныя жаўнеры прыцягваліся да нясення гарнізоннай службы, выконвалі інжынерна-сапёрныя, паліцэйскія функцыі. Як адзначае Ю. М. Бохан, "высокія баявыя якасці "служэбных" ужо напрыканцы XVI ст. вылучаюць іх на першае месца ў сістэме арганізацыі ўзброеных сілаў Вялікага княства" [4, с. 90]. Аднак кошт утрымання наёмнай арміі быў даволі высокім, а калі ўлічваць, што кварцянае войска ўтрымлівалася толькі з гаспадарскіх зямель, зразумелым становіцца малалікасць наёмнага войска як у Кароне, так і ў Літве.

У канцы XVI – першай палове XVII ст. былі праведзены вайсковыя рэформы, якія дакладна вызначылі роды войскаў і іх узбраенне. Літоўскае войска складалася з кавалерыі, пяхоты і артылерыі. Аснова войска - кавалерыя была падзелена цяжкую, сярэднюю і лёгкую. Да цяжкай кавалерыі, якая мела засцерагальнае ўзбраенне ў выглядзе паўдаспеха або кірасы, адносіліся гусары, ўзброеныя кап'ём, рэйтары, узброеныя пісталетамі або аркебузай. Асноўным арганізацыйным элементам кавалерыі з'яўлялася харугва, якая набіралася ротмістрам на падставе прыпаветнага ліста. Кола ротмістраў, у прынцыпе, было абмежаваным, таму што гэтую функцыю давяралі асобам, якія ўжо адзначыліся на полі боя і праявілі пэўныя арганізацыйныя здольнасці. Ротмістры, у сваю чаргу, ведалі тых ваяроў, якіх яны хацелі б прыцягнуць да службы ў сваёй харугве, таму на яе фарміраванне было б дастаткова некалькі тыдняў. Асноўнай тактычнай адзінкай харугвы з'яўляўся почат, які складаўся з таварыша і початавых – шараговых шляхціцаў. Колькасць ваяроў у почаце залежала аб фінансавых магчымасцей таварыша. Почат ротмістра мог налічваць тузін коней, паручніка або харунжага – 5–6, таварышоў – ад 1 да 4. Ад велічыні почату залежала месца канкрэтнага шляхціца ў харугве, ды і ў шляхецкай супольнасці ў цэлым. У гусарскіх харугвах ротмістрамі звычайна былі магнаты, таму фактычным кіраўніком харугвы з'яўляўся паручнік.

Гусарыя з'яўлялася асноўнай ударнай сілай літоўскага войска. Яе галоўнай наступальнай зброяй з'яўлялася дзіда, даўжыня якой дасягала 5 метраў. Удар дзідай на поўным скаку быў даволі моцным, ён прабіваў чалавека ў даспехах, але сама дзіда пры гэтым звычайна ламалася, таму далейшы бой гусар працягваў шабляй або палашом. Імклівая атака гусар разрывала шыхты варожага войска. Аднак

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

у забалочанай, лясістай, горнай мясцовасці, снежным полі яны былі практычна бездапаможнымі, таму што не маглі набраць неабходны разгон.

Больш функцыянальнымі ў гэтым плане былі рэйтары, якія шлі ў атаку на конях з агнястрэльнай зброяй, а далей працягвалі бой шаблямі і палашамі. Рэйтарскя харугвы або палкі падзяляліся на кампаніі, якія складаліся з 3 капральстваў па некалькі початаў у кожнай. На чале палка стаяў обершэр, кампаніяй кіраваў капітан. Рэйтарскія харугвы, у якіх служылі немцы з Інфлянтаў, Курляндыі і Прусіі, былі больш дысцыплінаванымі, чым гусары, але набраць кампанію рэйтараў было справай нялёгкай, асабліва ва ўмовах Трыццацігадовай вайны, калі адпаведна падрыхтаваныя жаўнеры "мелі апрацу" у Заходняй Еўропе. У 1617 г. каралеўскі ротмістр Я. Шверын атрымаў прыпаведны ліст на набор 100 рэйтараў, а з'явіўся з сотняй гусараў. У Рэчы Паспалітай айбольш цаніліся рэйтарскія падраздзяленні, якія складаліся з немцаў, найменш – польскія і літоўскія, што было звязана з лепшай баявой падрыхтоўкай, дысцыплінай і ўзбраеннем немцаў. Як адзначалі сучаснікі "сам па сабе рэйтар без убрання нямецкага нічога не варты" [11, с. 4].

Сярэдняя кавалерыя была прадстаўлена пяцігорцамі, якія былі абаронены круглымі шчытамі, кальчужнымі панцырамі і місюркамі. У больш позні час сталі выкарыстоўваць кірасы. У якасці наступальнага ўзбраення пяцігорцы выкарыстоўвалі кароткія дзіды (рагаціны), шаблі, пісталеты або ручніцы. У баю пяцігорцы часцей за ўсё выкарыстоўваліся як падтрымка гусараў для пераследу разбітага ворага або абыходу яго з флангаў. Для пяцігорцаў, як і для гусар быў характэрны таварыска-початавы прынцып арганізацыі харугвы.

Лёгкая кавалерыя была прадстаўлена казакамі. Прычым пад казакамі разумееца як шляхецкая кавалерыя ўзброенай па-казацку, так і гарадавыя казакі, якія неслі гарнізонную службу ў памежных гарадах. Татарская кавалерыя, будучыя ўланы, таксама адносіліся да казакаў, адрозніваючыся толькі сваім этнічным і рэлігійным складам, а таксама знешнім выглядам. Лёгкая кавалерыя мела падобнае да пяцігорцаў наступальнае ўзбраенне, але практычна не мела ўзбраення засцерагальнага.

Нягледзячы на тое, што ў еўрапейскай ваеннай справе першае месца ўжо даўно адводзілася пяхоце, усведамленне гэтага ў Рэч Паспалітую яшчэ не прыйшло. У Вялікім княства Літоўскім пяхота ў колькасным плане істотна саступала кавалерыі і складалася з двух частак: пяхоты польскай і нямецкай

Нямецкая пяхота фарміравалася з замежнікаў, пераважна немцаў, таму афіцыйнай мовай там была нямецкая. Арганізацыйнымі адзінкамі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

з'яўляліся рэгіменты (палкі), фрайкампаніі (асобныя роты) і камапніі (роты). На чале палка, які налічваў да 1 тыс. жаўнераў, стаяў оберштэр (палкоўнік), яго намеснікам з'яўляўся оберштлёйтнант. Фрайкампаніі і кампаніі, якія налічвалі ад 90 да 120 чалавек, знаходзіліся пад камандаваннем капітана. Кампаніі на 2/3 складаліся з мушкецёраў, якія былі ўзброены апрача мушкета яшчэ шабляй, 1/3 складалі пікінёры, узброеныя 3–5 метровай пікай або алебардай і таксама шабляй. Нямецкая пяхота адрознівалася выдатнымі баявымі якасцямі, але была вельмі дарагой. Кошт яе пераўзыходзіў нават гусарыю.

Гэтак званая польская пяхота набіралася з рускага, літоўскага і замежнага мяшчанства і дробнай шляхты, прычым афіцэрамі маглі быць нават нешляхціцы. Асноўным тактычным падраздзяленнем польскай пяхоты з'яўлялася рота, падзеленая на дзесяткі. Падчас бою рота шыхтавалася у некалькі шарэнг. У першай стаялі жаўнеры ўзброеныя павезамі, у другой – дзясятнікі, далей пікінеры. У наступных шарэнгах стаялі сталкі з ручніцамі, а замыкалі іх пікінеры. Для залпу ўся рота, акрамя апошняй шарэнгі стралкоў прысядала на адно калена, затым падымалася наступная шарэнга, пакуль яна страляла, апошняя шарэнга рыхтавалася да новага залпу [1, с. 37].

Спроба Стафана Баторыя ўвесці ў Рэчы Паспалітай рэкруцкую сістэму і прыцягнуць да службы ў войску сялянства аказалася не вельмі ўдалай. Хаця Стафан Баторый спадзяваўся збіраць каля 15 тыс. выбранцаў, на практыцы з усёй Рэчы Паспалітай рэдка ўдавалася сабраць больш за 2 тыс., а канкрэтна з Вялікага княства Літоўскага – некалькі соцень [1, с. 26; 6, с. 8; 12, с. 185]. Хаця ў Польшчы стварэнне выбранецкай пяхоты пачалося ў 1578 г., у Вялікім княстве Літоўскім соймавая канстытуцыя аб наборы па 1 выбранцу з кожных 20 валок гаспадарскіх зямель выйшла толькі ў 1595 г. [2, с. 83]. Асноўнай арганізацыйнай адзінкай выбранцаў з'яўлялася харугва колькасцю ад 100 да 200 чалавек, але на практыцы гэтая лічба заўсёды была меншай. На чале якой стаяў ротмістр і падначаленыя яму паручнік, харунжы і дзясятнікі. Ротмістр меў над выбранцамі поўную ўладу, у адсутнасць гетмана ён меў права смяротнага пакарання выбранца за пэўны праступак.

Узбраенне выбранцаў складалася з рушніцы (пазней мушкета), шаблі і сякіры. Выбранцы мелі права весці сваю гаспадарку, былі вызвалены ад павіннасцей, але ў выпадку вайны, яны па першаму загаду павінны былі з'явіцца ў азначаным месцы з узбраеннем і ў блакітнай форме адпведнага крою. Першую палову года выбранцы ваявалі на свій кошт, а затым атрымліваць плату па 2 злотых штомесяц.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У мірны перыяд прадугледжваліся рэгулярныя зборы для павышэння баявых навыкаў, але на практыцы ўзровень баявой падрыхтоўкі выбранцаў быў усё ж вельмі нізкім. Польны гетман Крыштаф Радзівіл у 1621 г. адзначаў, што "выбранцы, людзі не навучаныя" у вайсковым сэнсе [2, с. 84]. Гэта было звязана з імкненнем саміх выбранцаў, захаваўшы свае правы, пазбегнуць небяспечнай вайсковай службы, нежаданнем "бясплатна" ваяваць, нізкім узроўнем вайсковай падрыхтоўкі. У сувязі з гэтым выбранецкую пяхоту выкарыстоўвалі пераважна для гарнізоннай службы і фартыфікацыйных работ.

Дарэчы, у сувязі з тым, што ўтрыманне пастаянных гарнізонаў у замках таксама патрабавала грошай, а іх у скарбе не было, у мірны час у замках і гарадах не было і гарнізонаў, а абавязкі па абароне гарадскіх умацаванняў ускладаліся на мяшчан. Становішча саміх замкаў да сярэдзіны XVII ст. было далёка не лепшым. "Вялікая колькасць замкаў была пазбаўлена сучасных умацаванняў, былі драўлянымі або драўняна-земельнымі", адзначае Г. Віснер [3, с. 14]. Многія ўмацаванні патрабавалі рамонту, але сродкаў на гэта як заўсёды не хапала.

У першай палове XVII ст. у войсках Рэчы Паспалітай з'явіўся своеасаблівы сімбіёз пяхоты і кавалерыі – драгуны. Яны маглі ваяваць і на конях, але ўсё ж часцей ваявалі ў пешым шыхце, выкарыстоўваючы коней як сродак для хуткага прамяшчэння ў прасторы. Драгуны, як і ўсе пехацінцы практычна не мелі абарончага ўзбраення, а ў якасці наступальнага выкарыстоўвалі аркебузы, пісталеты, палашы або рапіры. Галоўным недахопам драгунаў з'яўлялася тое, што да траціны падраздзялення актыўна ў пешым баю не ўдзельнічала, даглядаючы коней. "З сотні толькі семдзесят б'юцца, а коней трымаюць", адзначае ў 1648 г. берасцейскі ваявода на сойме, хвалячы пры гэтым больш пяхоту [13, s. 234]. Тым не менш, улічваючы агульны трэнд да павелічэння ролі пяхоты ў ваеннай справе колькасць драгунаў у каронnай і літоўскай арміях пастунова ўзрастала.

Артылерыя ў Вялікім княстве Літоўскім падзялася на дзяржаўную і прыватную, а паводле функцыянальнага прызначэння – палявую і фартыфікацыйную. У выніку вайсковых рэформ Уладзіслава IV артылерыя была выведзена ў асобны корпусна часле с асобнай службовай асобай – генералам артылерыі. Для забеспячэння арміі гарматамі ў Вільні была створана людвісарня. Аднак, нягледзячы на станоўчыя зрухі, недахоп сродкаў трымаў літоўскую артылерыю ў гаротным стане. Хранічнай праблемай было своечасовае забеспячэнне порахам, ядрамі, цяглавай жывёлай.

Лепш выглядалі справы ў прыватнай артылерыі. Прыватныя гарады, такія як Слуцк, Быхаў былі добра ўмацаваны гарматамі, нанятыя



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

за магнацкія грошы пушкары былі больш дасведчанымі ў сваёй справе, што ў наступным праявілася падчас баявых дзеянняў.

Казацка-сялянская вайна выявіла ўсе недахопы сістэмы абароны Рэчы Паспалітай і спрыяла правядзенню шэрагу рэформ у гэтай сферы. У прыватнасці прышло разуменне неабходнасці перанясення апоры ў сістэме абароны з паспалітага рушання на рэгулярнае войска. У 1652 г. на змену кварцянаму воску прыйшло войска кампутовае, якое, хаця і залежала ад сойма, але аплочвалася не толькі з гаспадарскіх зямель, а таксама існавала ў мірны час. У 1649 г. быў ўведзены спецыяльны падатак – падымнае, які даў магчымасць утрымліваць кампутовае войска ў вялікім княстве. Колькасць жаўнераў у кампутовым войску была большай, але ўсё роўна недастаткова ва ўмовах гепалітычных зменаў, якія адбываліся ва Ўсходняй Еўропе ў другой палове XVII ст. Так, у перыяд вайны Расійскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. войска Вялікага княства Літоўскага складала 10–12 тыс. чал., што было аб'ектыўна мала каб супрацьстаяць агрэсіі з боку Расійскай дзяржавы і Швецыі [6, s. 43–44]. Такім чынам, рэальная адсутнасць войска ў Вялікім княстве Літоўскім і шматлікія супярэчнасцямі ў пануючым стане абвостраныя смерцю караля, падрыхтавалі глебу да з'яўленні казакаў у паўднёва-ўсходняй частцы вялікага княства і літоўскага і пачатку грандыёзнага сялянска-мяшчанскага паўстання.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1 Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя / Г. Саганович. – Мінск: "Энцыклапедыкс", 2001. – 412 с.

2 Wisner, H. Wojsko litewskie 1 połowy XVII wieku. Cz I / H. Wisner // Studia i materialy do historii wojskowości. – Warszawa, 1973. – T. XIX. – Cz. I. – S. 61–138.

3 Wisner, H. Wojsko litewskie 1 połowy XVII wieku. Cz II / H. Wisner // Studia i materialy do historii wojskowości. – Warszawa, 1973. – T. XX. – Cz. I. – S. 5–26.

4 Бохан, Ю. М. Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV–XVI ст. / Ю. М. Бохан. – Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2004. – 92 с.

5 Шиляев, А. П. Организация армии ВКЛ в конце 16 – начале 17 в. / А. П. Шиляев // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны: зборнік навук. артыкулаў; вып. 2; рэдкал.: Р. Р. Лазько [і інш.]. – Гомель: УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2013. – С. 5–9.

6 Rachuba, A. Wysiłek mobilizacyjny Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1654–1667 / A. Rachuba // Studia i materialy do historii wojskowości. – Białystok, 2007. – T. XLIII. – S. 43–60.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7 Rachuba, A. Siły zbrojne Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVII wieku / A. Rachuba // Przegląd Wschodni. – 1994. – T. 3. – Zeszyt 3(11). – S. 379–410.
8 Бярнацкі, В. Паўстаньне Хмяльніцкага: Ваенныя дзеньні ў Літве ў 1648–1649 гг. / В. Бярнацкі // ARCHE = Пачатак. – 2008. – № 3. – С. 45–222.
9 Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=11631. – Дата доступу: 05.08.2016.
10 Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года [Электронны рэсурс]. – Мінск, 2003. – Рэжым доступу: http://litopys.org.ua/statut2/st1566_03.htm. – Дата доступу: 05.08.2016.
11 Raczkiewicz, D. Udział rajtarii litewskiej w wojnie Inflanckiej ze Szwecją w latach 1621–1622 / D. Raczkiewicz // Studia historiczne. – 2015. – Z. 1. – S. 3–24.
12 Żygulski, Z. Bron w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy I Bliskiego Wschodu / Z. Żygulski. – Warszawa: PWN, 1975. – 332 s.
13 Jakuba Michałowskiego, wojskiego lubelskiego, a późniéj kasztelana bieckiego, Księga pamiętnicza. – Kraków: w drukarni C. K. Uniwersytetu, 1864. – 838 s.

***Stanislau Czaropka.* The army of the Grand Duchy of Lithuania on the eve of the Cossack and peasant war 1648–1651.** *This article explores some aspects related to the beginning of the Cossack and peasant war 1648–1651 in the Grand Duchy of Lithuania. In particular shows the structure and organization of the Lithuanian army, its functioning system that helps you understand the reasons for the easy penetration of Cossack units in Palessie and the Dnieper basin and the rapid spread of the uprising here.*

*УДК 929.52/929.521*

**Ю. В. Панков**
Гомельский дворцово-парковый ансамбль

## К ВОПРОСУ О СОСТАВЛЕНИИ РОДОСЛОВНОЙ РОДА СЛУЖЕК ГЕРБА ОСТОЯ

*Статья посвящена истории изучения генеалогии рода Служек герба Остоя. Род Служек добился вершины могущества во второй половине XVII в., став одной из богатейших и влиятельных фамилий Речи Посполитой. В статье проведено историко-генеалогическое исследование и составлена наиболее полная родословная этого известного в Речи Посполитой шляхетского рода, в которую вошли не только представители мужской, но и женской линии Служек.*

В последние годы в мировой исторической науке становится популярной тема генеалогических исследований. Все чаще ученые



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ